ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.48 (3312) ● ЧАЦВЕР, 20 СНЕЖНЯ, 2012

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**

Шчыры дзякуй землякам
Што пабачылі і як сябе адчувалі расійскія журналісты ў Беларусі
Стар. 2



Ганна, спявачка з Антверпена
З Мінска ў Бельгію прывялі жыццёвыя шляхі Ганну Селіванаву Стар. 3

Ад першых крокаў — да балю
Дзесяць гадоў таму адпачынак у вёсцы быў дзівам, а цяпер па краіне — амаль дзве тысячы аграсядзіб Стар. 4

СТЫЛЬ ЖЫЦЦЯ

Бліжэй да вытокаў

Калядныя і Навагоднія дні не абыдуцца без розных забаўляльных імпрэз. Кіраўнік гурта “Стары Ольса” Зміцер Сасноўскі свярджае: цікавасць да беларускай сярэднявечнай музыкі штогод павялічваецца.

Дудар Зміцер Сасноўскі грае ля знакамітага Навагрудскага замчышча

Песню пра Саўку ды Грышку, пэўна ж, ведаюць многія, аднак — у перайначанай версіі: казалі, яе словы адаптаваў пад новую рэальнасць Янка Купала. А раней спявалі беларусы так: “Саўка ды Грышка ладзілі дуду/ Павесяліцца з ёй на Каляду./ Ду-ду-ду, ду-ду-ду,/ З ёй на Каляду”. Атрымліваецца, спецыяльна да Каляд рыхтавалі дудары свае музычныя інструменты, без іх не абыходзіліся і іншыя сакральныя абрады.

Зміцер Сасноўскі — адзін з вядомых сучасных дудароў. У свой час ён з сябрамі задумаў найбольш поўна рэканструяваць музычныя традыцыі Вялікага Княства Літоўскага. Так і ўтварыўся ў 1999 годзе гурт “Стары Ольса”: спачатку як праект Зміцера Сасноўскага, які запрашаў да ўдзелу сесійных музыкаў. Цяпер у гурце іх шасцёра, граюць на старадаўніх інструментах: дудах, шалмеях, флейтах, лютнях, цыстрах і іншых. Што яшчэ іх аб’ядноўвае, як развіваецца гурт і ці ёсць будучыня ў беларускай сярэднявечнай музыкі — пра тое мы і гаворым са Зміцерам.

— Сёння ў Беларусі, ды і ўвогуле ў Еўропе, нямала музыкаў, якія граюць сярэдневяковую музыку. Як вам удаецца вытрымліваць канкурэнцыю?

— На думку нашых прыхільнікаў, нас вылучае напрацаваная гадамі сыгранасць і падбор рэпертуару. Раней мы шмат увагі надавалі стылізацыі пад даўніну. Пазней браліся толькі за аўтэнтычныя тэксты, а цяпер спалучаем адно і другое. Паколькі ўдалося здабыць арыгінальную натацыю “Полацкага сшытка” (даследчыкі называюць яго і “Астрамечаўскі сшытак” — па назве таго паселішча пад Брэстам, дзе ён некалі ствараўся. — **Рэд.**), то цяпер ён у цэнтры ўвагі. І гэта асноўны змест працы групы. Увогуле ж, нягледзячы на тое, што мы наперадзе ў выкананні аўтэнтычнай музыкі, няма, як кажуць, мяжы дасканаласці.

— Беларускія музыкі часцяком едуць працаваць за мяжу і нярэдка становяцца там больш папулярнымі, чым на Бацькаўшчыне. Дзе “Стары Ольса” больш вядомы: у Беларусі або за яе межамі?

— Гадоў пяць таму склалі статыстыку: 34 канцэрты было ў нас за год, і ўсяго 8 з іх у Беларусі. Апошнім жа часам прапорцыя мяняецца, і гэта радуе. Урэшце колькасць канцэртаў за мяжой і ў Беларусі выраўнялася. Раней мы не маглі сабраць канцэртную залу “Мінск” — цяпер збіраем.

— А дзе ў замежжы найлепш прымаюць вашу музыку?

— Ва Украіне асабліва цёпла, і ў Польшчы. То не дзіўна: там можна размаўляць па-беларуску і цябе зразумеюць. Гэта вельмі прыемна. А з Польшчай нашы музычныя культуры развіваліся пэўны час разам: адны і тыя ж музыкі гралі пры трох каралеўскіх дварах: у Кракаве, Вільні і Гародні. Здзівіла, дарэчы, як шмат прыхільнікаў у Празе. У адрозненне, напрыклад, ад Расіі. Але апошнім часам і там ёсць інтарэс. Прынамсі, “Стары Ольса” быў сёлета запрошаны ў Цвер на фестываль сярэднявечнай культуры. Ну а самая экзатычная краіна, дзе нам давялося выступаць, відаць, Сардзінія. Цэлы месяц пражылі ў галоўным яе горадзе Кальяры. → Стар. 3

ТРАДЫЦЫІ

Дзед Мароз, ён жа Зюзя…

Колькі імёнаў у таго, хто прыносіць падарункі дзецям на навагоднія святы

Іна Ганчаровіч

На навагодніх святах, акрамя ёлкі, падарункаў і весялосці, абавязкова ёсць Дзед Мароз. Загадкавая асоба, імёны мае розныя: у ЗША гэта Санта Клаўс, у Аўстрыі — Сільвестр, у Англіі — вядомы Бацюхна Ражджаство, у Кітаі — Шэн Дань Лаожэнь. У беларускага дабрадзея дзетвары імёнаў чатыры. Ну, хто адразу адгадае — той цукерку атрымае! Адказ: у нас прыжыліся тры “міжнародныя” яго брэнды — Дзед Мароз, Санта Клаўс і Святы Мікалай. Ёсць і яшчэ адзін — нацыянальна арыентаваны язычніцкі Зюзя. Усе чацвёра — моцныя дзяды, але выглядаюць па-рознаму. Маюць розную вопратку, характары, і далёка не ўсе робяць падарункі.

“Зюзя на дварэ — куцця на стале”

Самым беларускім Дзедам Марозам, пэўна, можна лічыць даўным-даўно вядомага ў нашых мясцінах Зюзю. Імя яго, падказваюць даследчыкі, бярэ пачатак ад даўняга дзеяслова “зюзець”, што азначае: мерзнуць, калець ад марозу. У беларускай міфалогіі Зюзя — гэта бог зімы і марозу. Паводле паданняў, дзядок Зюзя нізенькага росту, але моцны, з белымі як снег валасамі і такой жа доўгай барадой. Носіць цёплае белае адзенне, а ходзіць, дзівак, без шапкі і выключна басанож. Пры сабе абавязкова мае жалезны кій. Характарам Зюзя гарачы і калі злуецца, то б’е кіем сваім па пнях і дрэвах так, што зямля скаланаецца. Прычыны для незадаволенасці ў яго розныя. Ён можа папярэдзіць аб набліжэнні лютай сцюжы і завеі, ці суровай зімы на наступны год.

Дзеда Мароза цяпер шмат дзе сустрэнеш

Продкі нашы адначасова і баяліся, і паважалі яго. Каб неяк задобрыць старога, дарылі яму падарункі. Так, пад час Каляд, калі рыхтавалі адмысловую абрадавую куццю, выстаўлялі яе на ноч на асобным стале і запрашалі Зюзю ў дом са словамі: “Мароз, Мароз! Хадзі куццю есці! Каб ты не марозіў ячменю, пшаніцы, гароху, чачавіцы, проса, грэчкі і ўсяго, што мне Бог судзіць пасеяць!” Калі на другі дзень мароз паслабее, то кажуць, што гэта “мароз паеў куцці і паласкавеў”. А калі зробіцца мацнейшым, значыць, куцця не спадабалася, вось і “разгневаўся марозе...”

Дарэчы, фальклорны вобраз Зюзі ўжо адноўлены-ажыўлены, і пасяліўся дзед пад Паставамі побач з вёскай Азяркі, таму і назвалі яго Зюзя Паазерскі. У яго вотчыну часта прывозяць турыстаў, якія ў карчме з задавальненнем частуюцца стравамі ад Зюзі: ім даюць чарачку, скварачку і салёны агурочак. Смачна!

“У Міколін дзень ва ўсякай хаце піва”

Ушанаванне святога Мікалая на беларускіх землях пачалося, мусіць, напрыканцы X стагоддзя, калі тут з’явіліся хрысціяне. Сёння, як вядома, гэтага святога лічаць гістарычным продкам і Дзеда Мароза, і Санта Клаўса. → Стар. 4

БЛІЗКІЯ ЛЮДЗІ

Шчыры дзякуй землякам

Што пабачылі і як сябе адчувалі расійскія журналісты ў Беларусі

Іван Ждановіч

Днямі ў рэдакцыю напісала наша суайчынніца, журналістка з Цюмені Людміла Бакланава. Падзялілася радасцю: яна ўпершыню наведала Беларусь з іншымі удзельнікамі прэстура, які прысвячаўся падзеям вайны 1812 года. У лістападзе, нагадала, яго для журналістаў Расіі арганізавалі Нацыянальны прэс-цэнтр Беларусі і Пастаянны Камітэт Саюзнай дзяржавы. Прыемна было даведацца, што наша пастаянная аўтарка аказалася і ў ліку лаўрэатаў конкурсу журналісцкіх работ за 2011 год у намінацыі "Публікацыі, што асвятляюць культуру, мастацтва, спорт, ахову здароўя і адукацыю ў Саюзнай дзяржаве". Узнагароды ўрачыста ўручаліся ў мінскім Доме Масквы, і хоць высока была ацэнена журы найперш публікацыя Людмілы ў "Российской газете" "Сібіракі сябраваць умеюць", аднак, паведаміла калега, прыкладвала яна і ўсе свае артыкулы, змешчаныя ў "Голасе Радзіма". А наступным разам, напісала, абавязкова прадставіць на конкурс новыя публікацыі.

Мы пацікавіліся ў Людмілы: як праходзіў прэс-тур, ці гасцінна сустракалі расійскіх журналістаў беларусы. "Мае самыя шчырыя словы падзякі за ўвагу да нас — саветніку і прэс-сакратару Пасольства Беларусі ў Расіі Аляксандру Гардзейчыку, супрацоўнікам прэс-цэнтра Кацярыне Кібук і Станіславу Андросіку, — тут жа атрымалі з Цюмені электроннае пісьмо ў адказ. — Народ, як вядома, можа праславіць асобу, але і кожная асоба прадстаўляе свой народ. І тыя, хто з намі былі пастаянна, дэманстравалі высокі ўзровень гістарычных ведаў, душэўнасць, кампетэнтнасць, увагу і клопат. Аляксандр Гардзейчык — кандыдат гістарычных навук, усебакова адукаваны чалавек, з добрым пачуццём гумару і высокай адказнасцю. Станіслаў Андросік — гісторык, закончыў аспірантуру, з годнасцю і навуковай дакладнасцю адказваў на шматлікія, часам цяжкія пытанні. А Кацярына Кібук, калега-журналістка, беражліва апекавалася намі, ствараючы ў розных сітуацыях камфортныя ўмовы, магчымасці свабодных зносін з усімі, з кім жадалі сустрэцца журналісты".

Далей журналістка напісала, што ў Барысаве і на Брылёўскім полі (адно са знакавых месцаў вайны 1812 года) экскурсаводам была Лілія Вязовіч, якая ўразіла ўсіх глыбокім веданнем гістарычнага матэрыялу. А ў мінскім Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Людміла Бакланава проста ганарылася тым, як тонка, разумна, патрыятычна правёў экскурсію малодшы навуковы супрацоўнік Дзмітрый Маскалёў. Яркія ўражанні пакінуў ва ўдзельнікаў прэс-тура хор Барысаўскай узорнай дзіцячай музычнай школы "Чароўнасць". Журналісты з Расіі ўдзельнічалі ў Міжнароднай канферэнцыі "Напалеон — Беларусь", наведалі Дом-музей калекцыянера Івана Каладзеева ў Барысаве, былі на выставах, адкрыцці памятнага знака "Смутак і пакланенне", на мітынгу-рэквіеме і бачылі паказальныя выступленні ваенна-гістарычных клубаў, якія зрабілі гістарычную рэканструкцыю бою на Брылёўскім полі.

Журналістка Л. Бакланава наведала Беларусь і атрымала ўзнагароду

Людміла Бакланава выказвае вялікую ўдзячнасць кіраўніцтву рэдакцыі газеты "Тюменская правда", Ганароваму консулу Беларусі ў Цюмені Уладзіміру Шуглю за магчымасць удзельнічаць у гэтым прэс-туры. І супрацоўнікам Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы, якія яго ладзілі. "Мы пабачылі Беларусь, дзе займаюцца выхаваннем пачуццяў, дзе патрыятызм не здадзены ў архівы часу і з'яўляецца важнай дзяржаўнай задачай, — чытаем у пісьме. — Мы змаглі больш даведацца пра гісторыю Айчыннай вайны 1812 года, і не губляем надзеі, што яна ў нас — агульная. Раней словамі "Мы — беларусы, з братняю Руссю/ Разам шукалі да шчасця дарог ...." пачынаўся гімн БССР. І хоць цяпер у беларускім дзяржаўным гімне іншыя словы, сэнс гэтага радка няхай застаецца нязменным".

Людміла Бакланава паведамляе, што журналісты "Голасу Радзімы" "могуць прыехаць у Цюмень ды на свае вочы пабачыць нашчадкаў беларусаў-самаходаў, якія захавалі да гэтай пары беларускія традыцыі. Нядаўна, дарэчы, да іх у Вікулаўскі раён ездзіла дэлегацыя з Інстытута культуры Беларусі. Будуць рады сустрэцца, пагутарыць з беларускімі журналістамі як лідар беларусаў Цюмені Уладзімір Шугля, так і старшыня нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Беларусь" Аляксандр Яфімчык".

Што ж, дзякуй за цёплыя лісты, Людміла! Спадзяюся, мы сустрэнемся з землякамі і ў Цюмені.

Запрасілі на кірмаш

Алесь Дзвіневіч

Беларусы Даўгаўпілса ў чарговы раз зладзілі вясёлае нацыянальнае свята

"Беларускі кірмаш" — яркая і запамінальная назва для свята, якое штогод ладзяць нашы суайчыннікі ў латышскім Даўгаўпілсе. Сёлета імпрэза ў Палацы культуры і спорту пачалася з тэатралізаванай дзеі: беларускі народны тэатр таварыства "Уздым" паказаў вясёлае відовішча па матывах п'ес беларускіх класікаў "Збянтэжаны Саўка" Леапольда Родзевіча і "Паўлінка" Янкі Купалы. Рэжысура была Веры Храмнікавай, а свае артыстычныя здольнасці гожа праявілі Галіна Сантоцкая, Ганна Петкуне, Барыс Іваноў, Яўген Віршута, Тэрэза Паўлава і Павел Прозар. Затым выступілі мясцовыя беларускія вакальныя калектывы "Купалінка" і "Ластаўкі", а таксама танцавальны гурт "Лянок".

Далей вясёлы кірмашовы настрой у зале дапамагалі ствараць і госці: выступалі беларускія народныя ансамблі "Рабінушка" з Прэйляў, "Куток" з Краславы, "Завіруха" з Екабпілса, "Язынка" з вёскі Язна Міёрскага раёна і "Світанак" з Вісагінаса. Побач з беларускімі народнымі песнямі прагучала і некалькі песен на словы беларускага паэта Станіслава Валодзькі, аўтар прачытаў і свой верш, прысвечаны беларускаму кірмашу. Удзельнікаў свята вітаў генеральны консул Беларусі ў Даўгаўпілсе Віктар Гейсік. Сярод ганаровых гасцей "Беларускага кірмашу" былі старшыня Саюза беларусаў Латвіі Валянціна Піскунова, старшыня таварыства "Прамень" з Рыгі Алёна Лазарава, старшыня беларускага таварыства "Крок" з Вісагінаса Алег Давідзюк і начальнік аддзела культуры Міёрскага райвыканкама Аляксандр Тронькін.

На кірмашы ў Даўгаўпілсе

ДОБРАЯ СПРАВА

"Крыніца" ля Чорнага мора

У радыёэфіры Севастопаля гучыць беларуская мова

"Гаворыць Севастопаль! Добры дзень, паважаныя слухачы! У эфіры — радыёперадача "Крыніца" Севастопальскага таварыства "Беларусь"... Так з 29 лістапада на Севастопальскім радыё пачынаюцца перадачы беларускай суполкі. Падзея для нас вельмі значная: упершыню па радыё мы можа расказваць севастопальцам пра беларусаў, нашу Бацькаўшчыну, дзейнасць суполкі. "Крыніца" стартавала паспяхова. Першая перадача рыхтавалася як прэзентацыйная. Мы расказалі пра геаграфічнае становішча Беларусі, нашы гарады, рэгіёны. Слухачы даведаліся пра яе пачэснае месца ў сусветнай супольнасці. І я расказала пра гісторыю нашай суполкі, кірункі яе дзейнасці.

Мы гаворым у эфіры і пра тое, што след нашых землякоў-беларусаў у гісторыі Севастопаля значны. І ў Крымскую вайну, і ў Вялікую Айчынную беларусы былі ў шэрагах змагароў супраць агульнага ворага, паказвалі прыклады гераізму. А першы гарадскі помнік з ёмкім патрыятычным надпісам на пастаменце "Нашчадкам у прыклад" быў адкрыты ў 1839 годзе Аляксандру Казарскаму — нашаму земляку з горада Дуброўна Віцебскай вобласці за подзвіг на Чорным моры ў бітве супраць турэцкіх караблёў. Пра тое мы раскажам падрабязна ў наступных перадачах.

Ала Гарэлікава пад час запісу ў радыёстудыі

Актывісты суполкі "Беларусь" шмат робяць, каб у горадзе ведалі пра беларусаў, нашу культуру, народную творчасць, каб гучала тут беларуская мова. Добра вядомы тут народны калектыў беларускай песні "Белая Русь". Пры суполцы ёсць і народны тэатр! Таму так цікава праходзяць у нас "Беларускія калядкі", "Купалле", "Жаніцьба Коміна", "Гуканне Вясны". Цяпер робіцца пастаноўка "Беларускія пачастункі" — пра нацыянальную кухню. А колькі выставаў беларускай народнай творчасці было! На вуліцах Севастопаля, у Херсанесе, у навучальных установах і бібліятэках… Шмат зрабілі літаратурна-музычных кампазіцый у гонар нашых пісьменнікаў, у гонар Уладзіміра Мулявіна і калектыву "Песняры". Пра ўсё гэта і не толькі можна будзе пачуць на хвалях "Крыніцы". Будзем запрашаць гасцей з Беларусі, расказваць пра Айчыну, яе гісторыю і сучаснасць, знаёміць з класікамі літаратуры, сучаснымі майстрамі слова, традыцыямі народа.

З душой выконваюць абавязкі дыктараў "Крыніцы" Зінаіда Падарожняя і Валерый Каз'янін. Падтрымку маем і ад гарадскога Нацыянальнага цэнтра: там нам дапамаглі набыць для актыву "Крыніцы" лічбавы дыктафон. Наперадзе ў нас шмат цікавай, творчай працы. Падрыхтаваны перадачы на студзень, у якіх раскажам пра 1150-годдзе старажытнага Полацка, пра традыцыі святкавання беларускіх Каляд. Нам дасылаецца газета "Голас Радзімы", артыкулы з яе таксама будзем абавязкова выкарыстоўваць.

Ала Гарэлікава,
старшыня Севастопольскага таварыства "Беларусь"

СТЫЛЬ ЖЫЦЦЯ

Бліжэй да вытокаў

Музыкі гурта “Стары Ольса” — частыя госці на Калядных імпрэзах

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Там “Старога Ольсу” прынялі з цікаўнасцю. Як вядома, італьянцы аддаюць перавагу вакальнай культуры, гастралёраў яны ацэньваюць па спевах, нашы песні слухалі вельмі ўважліва.

— Відаць, маеце сяброў-музыкаў у замежжы. Хто гэта?

— Ва Украіне Kings and Beggars, у Польшчы — Open Folk, Persival і іншыя. Ёсць сябры і ў Германіі. Да нас прыязджаў гурт Fidelius. Былі канцэрты “Старога Ольсы” ў Празе, і дыскі нашы выпускаліся ў Чэхіі. А праз інтэрнэт іх можна набыць і ў Польшчы. Запісы там на англійскай мове.

— “Стары Ольса” ўдзельнічае ў многіх фестывалях, а вы самі яшчэ і прадзюсар “Дударскага фэсту”. Якімі вам бачацца тэндэнцыі развіцця музыкі беларускага сярэднявечча?

— Іх якраз высветліў сёлетні “Дударскі фэст”. Так, наша фальклорная сцэна шукае новыя формы. У прыватнасці, гурт Testament граў на электронных інструментах з ды-джэем. Гэта спосаб перанесці даўнюю музыку ў прымальную і зразумелую сучаснаму слухачу форму мадэрновага дэнса. Мы з сябрам Дзянісам Шматко, кіраўніком гурта “Тутэйшыя”, паспрабавалі сябе ў ролі ды-джэяў. І ўсё ўдалося, нават польскія музыкі, госці фэсту, выйшлі нас падтрымаць. Было весела. Радуе і рокавы кірунак: гурт “Літвінтроль”, скажам, выкарыстоўвае фолькавыя інструменты пры выкананні рокавай музыкі. Ды нягледзячы на ўсё, “Дударскі фэст” трохі застаяўся. І ёсць ідэя перанесці фэст на прыроду, выбіраем месца. Падштурхоўваем і фольк-выканаўцаў супрацоўнічаць з клубнай культурай, мадэрновай музыкай, ды-джэямі, асвойваць электронную сферу.

— “Стары Ольса” грае даўнюю музыку, у вас на сцэне адпаведныя строі. А ў жыцці вы якія?

— Я параўнаў бы так: як калісьці жыццё амерыканскіх індзейцаў стала сімвалам для экалагічнага руху, так цяпер экарух, рух за здароўе, набліжанасць да прыроды, імкненне да ўсяго натуральнага, вяртанне да зямлі, папулярны ў нас аграэкатурызм — усё гэта аднаго поля ягада з сярэднявечнай музыкай. Яна, у адрозненне ад музыкі іншай, натуральная, як ежа, пітво. Назіраю і тое, што нашы музыкі набываюць хутары, дамы ў вёсках, а хтосьці і жыве там ці рэгулярна бывае. Бліжэй да вытокаў…

Дарэчы. Нядаўна аб’яўлены вынікі конкурсу “Нацыянальная музычная прэмія” ў галіне эстраднага мастацтва. У намінацыі “Лепшы этна-фольк калектыў” перамог гурт “Стары Ольса”. Віншуем!

Гутарыла
Вераніка Бандаровіч

ЗЕМЛЯКІ

Каб ведалі нашчадкі

Максім Мароз

У Кішынёве ўшанавалі памяць пра вядомых мастакоў — ураджэнцаў Беларусі

Вечарыну памяці да 125-х угодкаў Марка Шагала і 90-х угодкаў Міхаіла Савіцкага ладзіла беларуская суполка Малдовы. У ёй удзельнічалі прадстаўнікі Пасольства Беларусі ў Малдове і Бюро міжэтнічных адносін Рэспублікі Малдова. Відэапрэзентацыю з цікавым аповедам пра творчасць майстроў жывапісу зрабіў намеснік старшыні суполкі, член Саюза мастакоў Малдовы Вячаслаў Ігнаценка. Ён не толькі прадставіў малавядомыя факты з біяграфій Марка Шагала і Міхаіла Савіцкага, але і зрабіў грунтоўны аналіз некаторых работ знакамітых жывапісцаў.

Як адзначыў старшыня беларускай суполкі Малдовы Юры Статкевіч, творчасць Марка Шагала і Міхаіла Савіцкага хоць і розная, але такімі суайчыннікамі можа ганарыцца кожны беларус, дзе б ні жыў. Паводле яго слоў, такія імпрэзы і ў далейшым будуць праводзіцца як намаганнямі сяброў абшчыны, так і з удзелам шырокага кола тых, хто гатовы да ўзаемадзеяння.

Варта дадаць, што сёлета ў Беларускай абшчыне Малдовы прайшоў шэраг мерапрыемстваў, творчых вечарын у гонар 130-х угодкаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, 100-х угодкаў Максіма Танка, 85-х угодкаў Алеся Адамовіча. У іх удзельнічалі і дзеці беларусаў Малдовы, якія наведваюць у пасольстве Беларусі нядзельную школу па вывучэнні мовы, літаратуры, культуры, традыцый і звычаяў этнічнай Радзімы.

ПЛАНЕТА ЛЮДЗЕЙ

Ганна, спявачка з Антверпена

З Мінска ў Бельгію прывялі жыццёвыя шляхі Ганну Селіванаву

Цудоўны голас аспіранткі Каралеўскай Фламандскай кансерваторыі ў Антверпене многія члены таварыства “Беларусь — Бельгія” ўпершыню пачулі сёлета на вечарыне “Марыс Метэрлінк і Беларусь”, што ладзілася ў Доме дружбы ў гонар 150-х угодкаў пісьменніка, лаўрэата Нобелеўскай прэміі. Дарэчы, з Бельгіі тады прыехалі і экспанаты на выставу твораў Метэрлінка, іх даслала арганізацыя “Перакрыжаванне раманскіх культур” і аддзел культурных сувязяў Міністэрства франкамоўнай Бельгіі — кнігі засталіся ў Беларускім дзяржуніверсітэце. Многіх зацікавіла: як наша суайчынніца Ганна трапіла ў Антверпен? Яна — мінчанка, вучылася ў 102-й школе (цяпер гімназія № 17) з музычным ухілам (клас цымбалаў), і ў сёмым класе стала лаўрэатам гарадскога конкурсу імя “патрона цымбалістаў” Іосіфа Жыновіча, а таксама Міжнароднага конкурсу ў Маскве. Спецыялісты прапанавалі ёй прадоўжыць адукацыю ў гімназіі-каледжы Акадэміі музыкі. Так і сталася, і Ганна яшчэ заваёўвала тытулы лаўрэата рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў.

Але ў 2006-м Ганна нечакана “здрадзіла” цымбалам: паступіла ў Расійскую акадэмію тэатральнага мастацтва, на факультэт музычнага тэатра. Стала займацца вакалам у майстэрні народнага артыста Расіі Дзмітрыя Бертмана. На першым курсе ўдзельнічала ў праекце італьянскага маэстра Дзіфірэлі: спявала ў оперы “Паяцы” Леанкавала. Два з легендарных спектакляў з яе ўдзелам прайшлі на сцэне Крамлёўскага тэатра.

Оперная спявачка Ганна Селіванава

На трэцім курсе Ганна спявала на сцэне Гелікон-Оперы ў пастаноўцы “Царская нявеста” Міхаіла Рымскага-Корсакава, а дыпломнай работай для яе стала партыя Вольгі ў спектаклі “Яўгеній Анегін” Пятра Чайкоўскага. Пасля быў славуты “Ла Скала” ў Мілане, іншыя заходнееўрапейскія тэатры, удзел у майстар-класах вядомых оперных зорак, дырыжораў. І, нарэшце, Антверпен. У 2011-м там упершыню ставілася опера С. Пракоф’ева “Мадалена”, дзе Ганна Селіванава спявала галоўную партыю. А сёлета ў Антверпене прайшоў Рускі тыдзень, які закончыўся сольным канцэртам беларускай спявачкі.

Але вернемся да вечарыны ў Доме дружбы. Ганна Селіванава спявала рамансы і арыі на беларускай, рускай, французскай ды іншых мовах. Пад бурныя апладысменты публікі. А праз колькі дзён яе цёпла прымалі землякі і ў Рэспубліканскім цэнтры нацыянальных культур, дзе ладзіўся яе сольны канцэрт рускіх рамансаў “Я пачуццямі жыву”. Выконваліся творы П. Чайкоўскага і С. Рахманінава. Акампаніравала спявачцы яе калега па антверпенскай вучэльні Марыяна Будко. Яна, дарэчы, таксама выпускніца гімназіі-каледжа пры Беларускай акадэміі музыкі, закончыла Каралеўскую Шведскую кансерваторыю і аспірантуру кансерваторыі ў Антверпене, лаўрэат міжнародных конкурсаў. Пасля канцэрта да Ганны і Марыяны падышоў народны артыст Беларусі Віктар Скорабагатаў. Ён падараваў ім трохтомнік твораў Максіма Багдановіча на дзесяці мовах, а таксама складзены і выдадзены самім рупліўцам Збор твораў Міколы Равенскага. Гэты кампазітар і дырыжор нарадзіўся 2 лютага 1886 года ў вёсцы Капланцы Бярэзінскага раёна, памёр у 1953-м у бельгійскім Лювене. Выкладаў у Лювенскім універсітэце, стварыў беларускі ансамбль, што гастраляваў як па Бельгіі, так і па Францыі і Вялікабрытаніі. Віктар Скорабагатаў, уручаючы падарункі таленавітым суайчыннікам, пажадаў, каб яны не забывалі Бацькаўшчыну, часцей прыязджалі дамоў з канцэртамі, а можа і вярнуліся назусім.

Тамара Антановіч,
старшыня таварыства
“Беларусь—Бельгія”

ЗЯЛЁНЫЯ МАРШРУТЫ

Ад першых крокаў — да балю

Дзесяць гадоў таму адпачынак у вёсцы быў дзівам, а цяпер па краіне — амаль дзве тысячы аграсядзіб

Кацярына Мядзведская

Адны з так званых першаадкрывальнікаў сельскага турызму — гаспадары сядзібы "Зарачаны" Андрэй і Ала Ніжнікі. "Мы, можна сказаць, людзі, апантаныя любімай справай, — прызнаваўся на нядаўняй прэс-канферэнцыі Андрэй Ніжнік. — Увесь час нешта перабудоўваем, дароблiваем. А для таго, каб забаўляць гасцей, запрашаем музычныя калектывы, ладзім паходы, экскурсіі…"

І такіх энтузіястаў, як Ніжнікі, шмат: Атары Лалуа, Ганна Кітун, Міхаіл і Ірына Макеі, Генадзь і Валянціна Траццякі… З кожным годам жадаючых заняцца новай справай становіцца ўсё больш. "Аднак нельга казаць, што шлях першапраходцаў заўсёды быў лёгкім, — мяркуе кіраўнік аб'яднання "Адпачынак у вёсцы" Валерыя Кліцунова. — Дзесяць гадоў таму мы і марыць не маглі, што прыгожая ідэя атрымае такое развіццё, вялізную падтрымку дзяржавы. Па сутнасці, яна вылілася ў нацыянальную ідэю, якая аб'ядноўвае самых розных людзей. Да таго ж сельскі турызм — гэта і вяртанне да нашых вытокаў, традыцый, папулярызацыя нацыянальнай беларускай культуры".

Па словах Валерыі Кліцуновай, у выпадку з агратурызмам усё склалася. Ідэю падтрымалі ў Міністэрстве спорту і турызму, мясцовыя ўлады і шматлікія партнёры. У многіх рэгіёнах сёння працуюць грамадскія саветы па развіцці аграэкатурызму, а нядаўна створаны і рэспубліканскі Савет. А колькі з'явілася цікавых праектаў і святаў! Згадаем хаця б яскравы фэст "Мотальскія прысмакі" ці свята "Вялікая бард-рыбалка"… Тым не менш чакаюць айчынны агратурызм і перамены. Так, Анатоль Ганец, гаспадар сядзібы "Ганка", упэўнены: праходзіць час, калі сядзіба давала гасцям толькі прытулак і пачастунак. "Сёння трэба дбаць пра тое, каб турыстам было цікава, а гэта можна рабіць толькі разам. Кластар, створаны ў Валожынскім раёне, выгадны не толькі гасцям, але і ўладальнікам сядзібаў. У турыстаў, якія да нас прыязджаюць, вочы разбягаюцца ад багацця паслуг — трэба аб'ядноўвацца", — адзначыў ён.

Аграсядзібы пацяшаюць гасцей узімку рознымі забавамі

Валерыя Кліцунова — таксама за кластары, за ўдасканаленне заканадаўчай базы. Каб, да прыкладу, гаспадары аграсядзіб маглі мець не адну, а дзве і больш гасцявых хат. Варта аднавіць праграму крэдытавання, а на базе апусцелых вёсак ствараць цэлыя агратурыстычныя курорты.

Ды тое — планы на будучыню. А цяпер усе, хто мае дачыненне да сельскага турызму, адзначаюць яго першы значны юбілей. Святкаванне дзесяцігоддзя прайшло, між іншым, у незвычайным фармаце: пад час загараднага балю з гучнай назвай "Пастараль у Мірскім замку".

Сувеніры на любы густ

Эдуард Півавар

Вырабы народных майстроў Беларусі дэманструюцца ў Маскве

Выстава "Народныя мастацкія промыслы Беларусі. Гісторыя і сучаснасць" адкрылася 14 снежня ў Маскве, у павільёне "Беларусь" Усерасійскага выставачнага цэнтра. Наведвальнікі экспазіцыі атрымалі магчымасць даведацца аб рамёствах, якія беларускія майстры зберагаюць, развіваюць, перадаюць з пакалення ў пакаленне. Многія рамёствы, як вядома, і сёння працвітаюць у Беларусі: у вялікай пашане кавалі, ткачыхі, а таксама тыя, хто займаецца саломапляценнем, ганчарным рамяством, цяслярствам, разьбой па дрэве.

Адначасова ў Маскве прадстаўлены тавары сучасных беларускіх мастацкіх промыслаў, якія могуць стаць і выдатным навагоднім падарункам. Гэта сувеніры, створаныя ўручную, дызайнерскія ўпрыгажэнні, посуд, прадметы інтэр'еру, адзенне, ёлачныя цацкі.

І будзе музыка

Вольга Кабяк

У чарговы раз цудоўныя класічныя мелодыі загучаць у Брэсце

XXXV Міжнародны фестываль класічнай музыкі "Студзеньскія музычныя вечары" пройдзе ў Брэсце 8-12 студзеня. Як паведаміла на прэс-канферэнцыі дырэктар музычнага форуму, старшыня абласнога грамадскага аб'яднання "Брэсцкае музычнае таварыства" Лілія Батырава, на юбілейны фестываль у горад над Бугам запрошаны музыканты і вакалісты з 25 краін, сярод якіх прадстаўнікі з Еўропы і СНД, ЗША, Кітаю, Японіі. Чакаецца самае вялікае прадстаўніцтва за ўсю гісторыю фестывалю, у ім паўдзельнічаюць больш за 700 музыкантаў і выканаўцаў, у ліку якіх больш за 60 салістаў-вакалістаў. Упершыню на сцэне Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы і музыкі імя Ленінскага камсамола Беларусі выступяць прадстаўнікі Даніі, Швецыі, Ямайкі.

Як і ў папярэднія гады, чакаецца прыезд у Брэст сусветных знакамітасцяў, сярод якіх народны артыст Расіі Захар Брон (скрыпка), народная артыстка Грузінскай ССР, народная артыстка СССР Ліяна Ісакадзэ (скрыпка), народны артыст Кіргізіі Уладзіслаў П'яўко (тэнар).

Шмат што на юбілейным фестывалі, як адзначыла Лілія Батырава, будзе ўпершыню. Напрыклад, вялікае дзіцячае прадстаўніцтва. Юныя лаўрэаты міжнародных конкурсаў з Малдовы, Польшчы, Казахстана, Украіны, Літвы, Беларусі. Яны выступяць у сумеснай праграме ў дзень адкрыцця фестывалю.

ТРАДЫЦЫІ

Дзед Мароз, ён жа Зюзя…

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

У адрозненне ад міфічнага Зюзі святы Мікалай — рэальны чалавек са старажытналікійскага горада Патары, з сям'і набожных, шляхетных і багатых бацькоў, якія далі яму імя Мікалай, што азначае: пераможца народаў. Сваімі добрымі ўчынкамі яшчэ ў IV стагоддзі ён праславіўся, калі ў хрысціян яшчэ не было падзелу на праваслаўных, каталікоў, пратэстантаў. Цяпер Міколаў дзень у каталікоў і пратэстантаў святкуецца 6-га, а ў праваслаўных 19 снежня. Але падарункі дзецям святы Мікалай не дорыць! Як пісала фалькларыстка Лія Салавей, на беларускіх землях раней наогул не было традыцыі дарыць калядныя падарункі. Таму дзецям трэба было заслужыць прысмакі пад час каледавання. Для гэтага пякліся спецыяльныя мірскія пірагі, і дзеці адпраўляліся па хатах з песнямі: выпрошваць пачастункі. Затое для дарослых Мікола быў сапраўдным святам. Напярэдадні варылі шмат бражкі ці піва. Увечары пры свечках пачынаўся абыход дамоў аднавяскоўцаў. Пры тым у кожнай хаце павінны былі наліць чарку ды выпіць з гасцямі. Вядома ж, весела ўсім было!

Цяпер у Дзеда Мароза ў памагатых не толькі Снягурачка

Адкуль прыйшоў Дзед Мароз?

Беларускі Дзед Мароз — з нашай савецкай мінуўшчыны. У аснову вобраза пакладзены славянская язычніцкая міфалогія і ўсе зімовыя багі, якім пакланяліся на Русі: Траскун, Студзянец, Марозка, Зімнік, Карачун. Спачатку чалавекалюбствам і бескарыслівасцю гэты персанаж не вызначаўся. Характар меў, мусіць, такі ж няроўны, як і беларускі Зюзя. Таму і яго даводзілася залагоджваць. З зімовага "тэрмінатара" ў добрага дзядулю, які раздорвае падарункі ўсім дзецям, ён ператварыўся толькі ў канцы 30-х гадоў XX стагоддзя. Пазней памяняўся і яго знешні выгляд. З фіялетавага футра ён пераапрануўся ў больш святочнае, чырвонае, вышыванае золатам. Ростам стаў вышэй, голасам памацнеў, і прыгожую ўнучку-спадарожніцу Снягурку сабе набыў. З 2003 года Дзед Мароз як гэткі правобраз славянскага братэрства абраў пастаяннае месца жыхарства ў Белавежскай пушчы. Так у яго свая шыкоўная сядзіба. У добрую казку адразу паверылі дзеці. Штодня на яго паштовую скрыню прыходзяць сотні лістоў ад іх. Таму беларускаму Дзеду Марозу адпачываць не прыходзіцца, працуе ён і гасцей прымае круглы год, толькі футра мяняе летам на простую світу.

Чараўнік з мяшком. Добры і шчодры

Як бачым, выбар галоўнага героя свята Новага года і Калядаў у беларусаў ёсць з каго зрабіць. Хочаш — едзь да беларускага Зюзі Паазерскага, хочаш — да Дзеда Мароза з славянскімі каранямі. А можаш святкаваць і з Санта-Клаўсам. Галоўнае: каб быў добры настрой! І хай прыносіць добры чараўнік у сваім мяху здароўе і шчасце ўсім, хай паспрыяе, каб збываліся ў Новым годзе нашы запаветныя жаданні.

Заснавальнік: Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск

Рэдактар Віктар Міхайлавіч Харкоў
Адрас рэдакцыі: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61. Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290 60 11

Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31
E—mail: golas_radzimy@tut.by

Аб'ём выдання: 1 друк. арк.
Тыраж: 1943, Заказ: 1343
Час падпісання ў друк: 20.10
Выходзіць 1 раз на тыдзень
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 3.04.2009. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
© "Голас Радзімы", 2012